Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»

УДК 37.013.8: 39 : 37.036(043.3)

**ТУБОЛЕЦ**
**Святлана Рыгораўна**

# ТРАДЫЦЫІ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯЎ

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка,
гісторыя педагогікі і адукацыі

Віцебск, 2015

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"

| | |
|---|---|
| **Навуковы кіраўнік:** | **Арлова Ганна Пятроўна,** доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры сацыяльна-педагагічнай работы ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава" |
| **Афіцыйныя апаненты:** | **Буткевіч Валянціна Уладзіміраўна,** доктар педагагічных навук, прафесар, прафесар кафедры педагогікі ўстановы адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт" |
| | **Калачова Ірына Іванаўна,** доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры сацыяльнай камунікацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| **Апаніруючая арганізацыя:** | установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" |

Абарона адбудзецца «03» лютага 2015 г. ў 12 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02.20.01 пры ўстанове адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава" на адрасе: 210038, г. Віцебск, вул. Чапаева, 30, аўд. 17; тэл. 26-14-44, e-mail: vit.sovet@tut.by.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"

Аўтарэферат разасланы "_____" снежня 2014 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый Н.І. Бумажэнка

# УВОДЗІНЫ

Прыярытэтнай задачай дзяржаўнай палітыкі і надзённай патрэбнасцю сучаснага грамадства ў кантэксце пошукаў эстэтычнага ідэалу з'яўляецца зварот да народнай спадчыны. Дадзеная акалічнасць патрабуе тэарэтычнага і практычнага вывучэння народнага педагагічнага вопыту, творчай рэалізацыі яго пазітыўнага патэнцыялу. Гэта актуалізуе разнастайныя даследаванні ў галіне этнапедагогікі. Навуковыя і практычныя накірункі вырашэння этнапедагагічных і этнакультурных праблем прадстаўлены ў працах беларускіх даследчыкаў: Г.П. Арловай (пераемнасць навуковай і народнай педагогікі), В.С. Болбаса (этыка-педагагічныя ідэі), Я.Д. Грыгаровіч (роля народнай культуры ў выхаванні асобы), К.У. Гаўрылавец, І.І. Казімірскай (маральна-эстэтычнае выхаванне), У.М. Конана (развіццё эстэтычнай думкі на Беларусі), В.К. Салеева (этнаэстэтыка).

Актуальнасць звароту да вывучэння традыцый народнай педагогікі беларусаў у эстэтычным выхаванні абумоўлена шэрагам супярэчнасцей:

– паміж зместам Канцэпцыі непарыўнай адукацыі і выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі, у якой задача духоўнага, у тым ліку эстэтычнага, выхавання выступае прыярытэтнай, і адсутнасцю цэласнай сістэмы эстэтычнага выхавання, заснаванай на этнакультурных традыцыях народа;

– паміж размытым эстэтычным ідэалам сучаснага грамадства, звязаным з адмоўным уплывам заходняй масавай культуры, і сфарміраваным на працягу стагоддзяў эстэтычным вопытам беларусаў, што знайшло ўвасабленне ў традыцыях народнага эстэтычнага выхавання;

– паміж усведамленнем навукоўцамі, асветнікамі, шырокай грамадскасцю адметнасці традыцый беларускай народнай педагогікі, яе значнасці для тэорыі і практыкі эстэтычнага выхавання і адсутнасцю фундаментальных навуковых даследаванняў па азначанай праблеме.

Актуальнасць тэмы, а таксама вышэйзгаданыя вызначаныя супярэчнасці даюць падставу для фармулёўкі праблемы даследавання – фарміраванне традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX - пачатку XX стагоддзя. Увага да абранага перыяду абумоўлена пашыраным выкарыстаннем традыцый беларускай педагогікі ў жыцці грамадства, якія на той час з'яўляліся адзіным сродкам выхавання дзяцей беларусаў. Пераважную колькасць насельніцтва складала сялянства, дзе панавала патрыярхальная сям'я як галоўны носьбіт народна-педагагічных традыцый. Гэты перыяд пазначаны з'яўленнем шырокага кола фундаментальных этнаграфічных і фальклорных прац Я.Ф. Карскага, М.Я. Нікіфароўскага, Е.Р. Раманава, А.К. Сержпутоўскага, П.В. Шэйна.

Асобныя аспекты народнага выхавання прадстаўлены ў працах айчынных вучоных В.У. Буткевіч, А.Э. Крываносавай, Ю.С. Любімавай, А.Л. Міхайлавай,

У.В. Пашкевіча, Л.В. Ракавай, у якіх даследуюцца традыцыі беларускай народнай педагогікі. Аднак на сённяшні дзень адсутнічае даследаванне, якое б цэласна, сістэмна раскрывала традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзяў, што актуалізуе значнасць звароту да заяўленай тэмы і праблемы.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь працы з грунтоўнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі**

Дысертацыйная работа выканана ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (ад 13 студзеня 2011 г. № 243-3), Законам аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь (ад 4 чэрвеня 1991 года №832-XII), Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнцкай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2011-2015 гады (ад 24 мая 2011 г. № 16), пп. 14.2 пратакола даручэнняў Першага намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь У.І. Сямашка ад 07.03.2012 № 34/пр, інфармацыйным лістом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 04-01-07/0-231/1 ад 12.06.2012, тэмы навукова-даследчай работы факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі "Навукова-метадычныя асновы ўдасканальвання прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў па сацыяльнай рабоце і псіхалогіі ва ўмовах ВНУ" (№ дзяржрэгістрацыі 20100101 ад 3 студзеня 2010г.), а таксама ў супрацоўніцтве з міжнароднай навукова-даследчай лабараторыяй УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", Віцебск і НАУ "Інстытут псіхалогіі і педагогікі", Масква (у межах дагавору аб супрацоўніцтве пры падрыхтоўцы спецыялістаў, № 1080 ад 26 снежня 2005 г.).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэта даследавання* – выявіць і даць цэласную характарыстыку традыцыям эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (канец XIX – пачатак XX стагоддзяў).

Дасягненне пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне *задач*:

1. Удакладніць паняційна-тэрміналагічны апарат у кантэксце даследавання традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы.
2. Раскрыць параметральныя характарыстыкі і асноўныя перадумовы фарміравання эстэтычнага ідэалу ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX ст.
3. Вызначыць асноўныя ўмовы рэалізацыі традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы перыяду канца XIX – пачатку XX ст.
4. Канкрэтызаваць змест традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы даследаванага перыяду.

5. Распрацаваць аўтарскую класіфікацыю метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX ст.

*Аб'ект даследавання* - беларуская народная педагогіка.

*Прадмет даследавання* – педагагічныя традыцыі эстэтычнага выхавання беларускага народа ў перыяд канца XIX – пачатку XX стагоддзяў.

**Навуковая навізна вынікаў даследавання.** Удакладнены змест паняццяў: "эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы", "традыцыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы". Распрацавана аўтарская класіфікацыя метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Вызначана прыярытэтная скіраванасць інтравертаваных і экстравертаваных метадаў эстэтычнага выхавання суадносна з узроставымі асаблівасцямі і напрамкамі эстэтычнага выхавання. Вылучаны галоўныя ўмовы здзяйснення эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (прыроднае ўздзеянне, выхаванне ў працы, выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці, распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага селяніна трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны як інтэнсіфікатары народнага духоўнага жыцця).

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, што выносяцца на абарону:**

1. Паняційна-тэрміналагічны апарат у кантэксце даследавання актуалізуе ўдакладненне наступных ключавых паняццяў:

*Эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы* – галіна практыка-выхаваўчай дзейнасці, накіраванай на выхаванне ў асобе жадання, здольнасці ўспрыняцця і разумення таго прыгожага, якое з'яўляецца жыццёва неабходным; фарміраванне на гэтай глебе эстэтычных густаў, эмацыянальных адносін да акаляючага свету і сацыяльнага жыцця праз авалоданне культурай продкаў. Эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы як працэс ахоплівае ўсе ўзроставыя групы, характарызуецца лінейнай працягласцю (ад нараджэння дзіцяці і на працягу ўсяго жыцця), мэтаскіраванасцю (фарміраванне эстэтычна дасканалай асобы), комплекснасцю (выхоўваюць людзі, прыродная рэчаіснасць, побыт), бесперапыннасцю (адбываецца падчас працоўнай дзейнасці і ў вольны час), цыклічнасцю (ажыццяўляецца на працягу году).

*Традыцыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы* – гістарычна афармленая на працягу стагоддзяў сістэма перадачы эстэтычных ведаў каштоўнасцей, поглядаў, густаў народа ў працэсе выхаваўчага ўзаемадзеяння пакаленняў пад уплывам нацыянальнай культуры, прыродных асаблівасцей, сацыяльнай спадчыны на падставе народна-педагагічных сродкаў і метадаў.

2. Параметральнымі характарыстыкамі эстэтычнага ідэалу беларускага народа з'ўляюцца: *дынамізм* (як існаванне шматварыянтнасці эстэтычна значнай з'явы, працэсу, адзінкі), *дэмакратызм* (як магчымасць і/або патрабаванне для

кожнага чалавека валодання майстэрствам і праяве апошняга ў працоўнай ці мастацкай дзейнасці), *кансерватызм* (як паступовае з'яўленне ці знікненне новых фальклорных форм, форм мастацкай выразнасці), якія дазваляюць кожнаму чалавеку ствараць прыгажосць суадносна з уласным бачаннем, але ў агульным нацыянальным накірунку.

*Асноўнымі перадумовамі* фарміравання эстэтычнага ідэалу ў беларускай народнай педагогіцы з'яўляюцца *аб'ектыўныя* (геаграфічныя, біялагічныя, класавыя) і *суб'ектыўныя* (нацыянальныя, рэлігійныя, працоўныя, маральныя, міжнацыянальныя).

Параметральныя характарыстыкі і асноўныя перадумовы прадвызначаюць выходныя ўстаноўкі і асаблівасці фарміравання эстэтычнага ідэалу ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX ст.: - эстэтычны ідэал народнай педагогікі варта разглядаць як абагульнены, адзіны для ўсіх беларусаў, у кантэксце ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння працоўнага, маральнага, разумовага, фізічнага ідэалаў; - праца з'яўляецца сувязным звяном паміж асобай і калектывам у агульнай эстэтычнай дзейнасці; - на першае месца ў эстэтычным ідэале выступае ўнутраная прыгажосць чалавека, яго душа, характар, розум, дзеянні, учынкі; - існуе цесная сувязь паміж эстэтычным ідэалам і сацыяльна-маральнымі паводзінамі (узаемаадносіны з суседзямі, аднавяскоўцамі, сямейнікамі); - эстэтычны ідэал беларускага народа замацаваны ў творчасці і свядомасці людзей, перадаецца з пакалення ў пакаленне праз традыцыі, мастацтва, фальклорную творчасць, абрадавыя дзеянні, у якіх выразна адлюстраваны традыцыі беларускай народнай педагогікі.

3. *Асноўнымі ўмовамі рэалізацыі традыцый эстэтычнага выхавання* ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стст. з'яўляюцца: прыроднае ўздзеянне (прырода паспрыяла ўзнікненню пачуцця прыгожага, развіла ўнутраную культуру, эстэтычны густ беларуса); выхаванне ў працы (працоўныя дзеянні, вынікі працы ініцыіравалі асэнсаванне іх эстэтычнай каштоўнасці); выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці (індывідуальная творчасць злівалася з калектыўнай мастацкай свядомасцю, пашыраючы ідэалы народнай эстэтыкі і адлюстроўваючы духоўны вопыт, эстэтычны густ); распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага селяніна грыяды: мары, народныя вераванні, успаміны як інтэнсіфікатары народнага духоўнага жыцця.

4. *Змест традыцый эстэтычнага выхавання* ў беларускай народнай педагогіцы вынікае з узаемадзеяння мэты, метадаў і сродкаў выхавання. Згодна з узроставымі асаблівасцямі, працэс эстэтычнага выхавання доўжыўся на працягу жыцця, але асноўная перавага ў станаўленні эстэтычнага светаўспрымання надавалася трыядзе: дзіця-падлетак-юнак. На падставе крытэрыю якасных

змяненняў у эстэтычнай свядомасці і дзейнасці асобы вызначаны наступныя перыяды: пачуццёвае ўваходжанне ў свет эстэтыкі; фарміраванне эстэтычнай свядомасці; стварэнне сістэмы эстэтычнага светаўспрымання; практычнае эстэтычнае пераўтварэнне рэчаіснасці.

У *перыяд пачуццёвага ўваходжання ў свет эстэтыкі* (*маленства*, ад нараджэння да 6-8 гадоў) асноўнымі выступаюць метады фарміравання непасрэднага пачуццёвага адлюстравання рэчаіснасці: назіранне, растлумачэнне, перакананне, гульня, якія рэалізуюцца праз выкарыстанне калыханак, пацешак, забаўлянак, лічылак. *Перыяд фарміравання эстэтычнай свядомасці* (*дзяцінства-падлеткавасць*, ад 6-8 да 12-14 гадоў) скіраваны на фарміраванне эстэтычных перажыванняў. Дзеці прывучаюцца кіравацца крытэрыем якасці – прыгажосцю. Выкарыстоўваюцца расповед, гутарка, дзеці ўводзяцца ў свет казак, загадак, прымавак і прыказак, гуляюць у гульні, крыніцай якіх з'яўляецца працоўная дзейнасць, працуюць. *Перыяд стварэння сістэмы эстэтычнага светаўспрыняцця рэчаіснасці* (*падлеткава-юнацкі*, ад 12-14 да 16-17 гадоў) аб'ядноўвае папярэднія і наступны перыяды, характарызуецца пераходам ад фарміравання эстэтычных перажыванняў да арганізацыі практычнай дзейнасці. *Перыяд практычнага эстэтычнага пераўтварэння рэчаіснасці* (*маладосць*, 16-17 год – падрыхтоўка да ўступлення ў шлюб) – арганізацыя эстэтычна значнай практычнай дзейнасці, якая адбываецца праз працу, святы, абрады, традыцыі.

5. *Аўтарская класіфікацыя метадаў эстэтычнага выхавання* ў беларускай народнай педагогіцы заснавана на скіраванасці на ўнутраны свет асобы або ад асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет. Адпаведна метады эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы класіфікуюцца на інтравертаваныя і экстравертаваныя. Гэтыя метады рэалізуюцца ў сям'і, мясцовай суполцы жыхароў, калектыве аднагодкаў і ў працэсе самавыхавання. *Інтравертаваныя* метады накіраваны на далучэнне асобы да свету прыгажосці: фарміраванне і развіццё ўмення бачыць, адчуваць, успрымаць, разумець, ацэньваць прыгожае, эстэтычна перажываць з'явы, учынкі. Сюды адносяцца: праца, гульня, прыклад і аўтарытэт, назіранне, перакананне, прывучэнне, практыкаванне, унушэнне, расповед, гутарка, тлумачэнне, ухваленне, заахвочванне, зварот да эстэтычных пачуццяў, павага да старэйшых, узаемная павага, грамадская думка, запалохванне, вымова, асуджэнне, саманазіранне. *Экстравертаваныя* метады скіраваны на фарміраванне ўменняў ствараць і захоўваць прыгажосць паводзін, зносін, працы, творчасці, прыроды. Да іх ліку адносяцца: праца, практыкаванне, прывучэнне, ухваленне, іспыт, спаборніцтва, грамадская думка, вымова, сумеснае правядзенне вольнага часу, супрацкі, гульня, пастаноўка перспектывы.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананым даследаваннем праблемы фарміравання традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX-пачатку XX стагоддзяў. Саіскальнікам удакладнены змест паняццяў: "эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы", "традыцыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы"; распрацавана аўтарская класіфікацыя метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы; вызначана прыярытэтная скіраванасць інтравертаваных і экстравертаваных метадаў эстэтычнага выхавання суадносна з узроставымі асаблівасцямі і напрамкамі эстэтычнага выхавання; вызначаны галоўныя умовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (прыроднае ўздзеянне, выхаванне ў працы, выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці, распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага селяніна трыяды - мары, народныя вераванні, успаміны – як інтэнсіфікатара народнага духоўнага жыцця).

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Вынікі дысертацыі абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедр педагогікі і сацыяльна-педагагічнай работы УА "ВДУ імя П.М. Машэрава"; у дзейнасці навукова-даследчай лабараторыі кафедры сацыяльна-педагагічнай работы УА "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"; на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях; на пасяджэннях міжнароднай навукова-даследчыцкай лабараторыі (НАУ "Інстытут псіхалогіі і педагогікі" (Масква) і УА "ВДУ імя П. М. Машэрава" (Віцебск)); курсаў павышэння кваліфікацыі (ДУА "Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі"); Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці; пры распрацоўцы раздзела вучэбнага курса "Этнапедагогіка" для студэнтаў ФСПіП УА "ВДУ імя П.М. Машэрава"; падчас кіраўніцтва студэнцкімі курсавымі і дыпломнымі працамі.

Навуковыя высновы і практычныя рэкамендацыі дысертацыі прадстаўлены аўтарам у выглядзе дакладаў і паведамленняў на 29 рэспубліканскіх і міжнародных навукова-практычных канферэнцыях. **Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Матэрыялы даследавання знайшлі адлюстраванне ў 41 публікацыі – 2 вучэбна-метадычных дапаможніках, 9 навуковых артыкулах (2 у сааўтарстве), апублікаваных у рэцэнзаваных часопісах, у 2 манаграфіях (1 – калектыўная), 28 матэрыялах навуковых канферэнцый (8 публікацый у сааўтарстве). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 413 старонак (25,7 аўтарскіх аркуша), з іх у сааўтарстве – 196 старонак (12,3 аўтарскіх аркуша).

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, дадатку. Агульны аб'ём асноўнай

часткі складае 128 старонак з уключэннем 2 малюнкаў і 3 табліц, што займаюць 11 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 319 найменняў на рускай і беларускай мовах і займае 20 старонак. Дадатак складае 60 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У першай главе **"Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання праблемы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы"** прадстаўлена абгрунтаванне тэарэтыка-метадалагічных асноў даследавання: удакладнены паняційна-катэгарыяльны апарат; раскрыты параметральныя характарыстыкі і асноўныя перадумовы фарміравання эстэтычнага ідэалу ў беларускай народнай педагогіцы перыяду канца XIX – пачатку XX стагоддзяў.

Пры аналізе сутнасці тэрміна *традыцыя* ўвага засяроджваецца на грамадскім функцыянаванні выхаваўчых традыцый, якія трактуюцца, з улікам навуковых пазіцый даследчыкаў П.П. Кампарса, В.Д. Плахава, І.У. Суханава. Сістэма традыцый этнасу з'яўляецца вынікам яго шматвекавых выхаваўчых намаганняў. Праз гэтую сістэму народ захоўвае сваю адметнасць і культуру (праяўляецца ў нацыянальным характары і каштоўнасцях). На падставе вышэйзгаданых падыходаў аўтар разглядае тэрмін *традыцыя* як агульнапрызнаную сістэму перадачы сацыяльна значных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, навыкаў, што гістарычна склалася на працягу стагоддзяў пад уплывам нацыянальнай культуры, прыродных асаблівасцей, сацыяльнай спадчыны і накіравана на захаванне і памнажэнне таго народнага вопыту, які неабходны для станоўчага існавання.

Параўнальна-супастаўляльны аналіз паняццяў "народ", "выхаванне", "традыцыі", дазволіў вызначыць змест паняцця "традыцыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы" як гістарычна аформленую на працягу стагоддзяў сістэму перадачы эстэтычных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, густаў народа ў працэсе выхаваўчага ўзаемадзеяння пакаленняў пад уплывам нацыянальнай культуры, прыродных асаблівасцей, сацыяльнай спадчыны на падставе народна-педагагічных сродкаў і метадаў.

Філасофска-метадалагічныя падыходы да эстэтычнага выхавання (М.С. Каган, М.І. Кіяшчанка, М.Л. Лейзераў); гістарычны практыка-арыентаваны аналіз зместу эстэтычнага выхавання беларускага народа ў працах айчынных навукоўцаў (Г.П. Арлова, В.С. Болбас, В.У. Буткевіч, К.У. Гаўрылавец, І.І. Казімірская, У.М. Конан, У.В. Пашкевіч, В.К. Салееў) дазваляюць сфармуляваць уласную пазіцыю аўтара. Мы разглядаем эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы ў якасці галіны практыка-выхаваўчай дзейнасці, якая накіравана на выхаванне ў асобе жадання, здольнасці ўспрыняцця і разумення таго прыгожага, што з'яўляецца жыццёва неабходным. На гэтай глебе адбываецца фарміраванне

эстэтычных густаў, эмацыянальных адносін да акаляючага свету і сацыяльнага жыцця праз авалоданне культурай продкаў. Эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы як працэс ахоплівае ўсе ўзроставыя групы, характарызуецца лінейнай працягласцю (ад нараджэння да смерці) мэтаскіраванасцю (фарміраванне эстэтычна дасканалай асобы), комплекснасцю (выхоўваюць людзі, прырода, побыт), непарыўнасцю (адбываецца падчас працоўнай дзейнасці і ў вольны час), цыклічнасцю (на працягу году).

Тэарэтычны аналіз філасофска-метадалагічнага аспекту эстэтычнага выхавання дае падставу для вываду, што часткай агульнага выхаваўчага працэсу з'яўляецца эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы, мэта якога – фарміраванне чалавека, здольнага бачыць, адчуваць, захоўваць і ствараць прыгожае ў кантэксце набліжэння да эстэтычнага ідэалу. Вывучэнне этнаграфічных матэрыялаў дае магчымасць сцвярджаць, што ў народнай педагогіцы эстэтычны ідэал складаюць адносіны чалавека да працы, людзей, асяроддзя. Гэты ідэал вызначаецца характарам беларусаў і грамадскім ладам. Прыгожым з'яўляецца сам чалавек з сукупнасцю маральных (асноўных), фізічных (другасных) якасцей і яго рацыянальна арганізаваная, мэтанакіраваная праца, якая прыносіць асалоду і задавальненне. Эстэтычны ідэал замацаваны ў творчасці і свядомасці людзей, перадаецца з пакалення ў пакаленне праз мастацтва, фальклор, абрадавыя дзеянні.

У якасці *параметральных характарыстык* эстэтычнага ідэалу беларускага народа вылучаем: дынамізм (існаванне шматварыянтнасці адной з'явы), дэмакратызм (асабістая творчасць), кансерватызм (паступальнасць змен форм мастацкай выразнасці), якія дазваляюць асобе ствараць прыгажосць суадносна з асабістым бачаннем, але ў агульным нацыянальным накірунку.

Выяўленне *асноўных перадумоў* фарміравання эстэтычнага ідэалу прыводзіць да неабходнасці размежавання іх на аб'ектыўны і суб'ектыўны блокі. У якасці аб'ектыўных перадумоў разглядаем геаграфічныя (асаблівасці прыродна-кліматычнай зоны), біялагічныя (тыповыя знешнія рысы чалавека), класавыя (замацаванасць у беларускай народнай педагогіцы эстэтычнага ідэалу сялянства). Да суб'ектыўных перадумоў адносяцца нацыянальныя (талерантнасць у стаўленні да іншых нацыянальнасцей), рэлігійныя (суіснаванне некалькіх канфесій, якія ўзаемна пашыраюць дыяпазон эстэтычных з'яў), працоўныя (успрыманне прыгажосці ва ўтылітарна-практычным сэнсе), маральныя (адзінства прыгожага і маральнага), міжнацыянальныя (уплыў ідэалаў іншых народаў).

Параметральныя характарыстыкі і асноўныя перадумовы прадвызначаюць зыходныя ўстаноўкі і асаблівасці фарміравання эстэтычнага ідэалу ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стст. Таму, пад эстэтычным ідэалам маецца на ўвазе не механічная сума ідэалаў асобных прадстаўнікоў беларускага

народа, а выяўленне тыповых якасцей, якія прысутнічаюць у рознай ступені і ў розных спалучэннях у пераважнай большасці індывідаў; трэба прымаць пад увагу ўзаемны ўплыў працоўнага, маральнага, фізічнага ідэалаў, якія таксама з'яўляюцца здабыткамі народнай педагогікі і існуюць у той жа часавай і межавай прасторах. Усведамляючы эстэтычны ідэал народа, важна ўлічваць яго гісторыю, культуру і дзейнасць.

Працоўная дзейнасць праз уплыў на пачуцці, свядомасць, змену акаляючай рэчаіснасці арганічна спалучае асобу і калектыў у адзінай эстэтычнай дзейнасці. Інтэграваны характар эстэтычнага ідэалу беларусаў выліваецца ў разуменне першаснасці ўнутраных якасцей чалавека: чысціні душы, дабрыні характару, гуманнасці дзеянняў і ўчынкаў, практычнасці розуму. Пацвярджэнне гэтаму знаходзім у фальклорнай творчасці з выразнымі ўяўленнямі аб прыгажосці чалавека, што адпавядае пералічаным крытэрыям. Эстэтычны ідэал пранізвае сацыяльна-маральныя паводзіны, што праяўляецца ва ўзаемаадносінах асобы з грамадствам. Такім чынам, эстэтычны ідэал беларускага народа замацаваны ў матэрыяльнай і духоўнай творчасці, народнай свядомасці. Механізмам яго перадачы служаць традыцыі, мастацтва, фальклорная творчасць і абрадавыя дзеянні.

У другой главе **"Рэалізацыя эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы перыяду канца XIX – пачатку XX ст."** вылучаны асноўныя ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы;ахарактарызаваны змест традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы; прадстаўлена аўтарская класіфікацыя метадаў эстэтычнага выхавання згодна з іх накіраванасцю на ўнутраны свет асобы або накіраванасцю ад асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет.

Асноўнымі ўмовамі рэалізацыі традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца:

– прыроднае асяроддзе – крыніца ўзнікнення пачуцця прыгожага; пад яе уплывам фарміруюцца праявы творчага духу, накіраваныя на пакланенне прыродзе, увасабленне, што замацавана ў міфалогіі, культах, абрадах, вераваннях;

– выхаванне ў працы, якая знітавана з асэнсаваннем эстэтычнасці вытворчых намаганняў і іх вынікаў. Менавіта пачуццё прыгожага, што нараджаецца ў працы (праз эстэтычнасць рухаў, гармонію працоўнага рытму і намаганняў, эстэтычнае задавальненне ад плёну), актуалізуе пачуццё прыгожага, абуджае цікавасць да творчасці. Прыходзіць разуменне, што ўнікальны прадукт атрымліваецца толькі тады, калі праца мае творчы характар, згодна з культурай як асобнага чалавека, так і грамадства ў цэлым;

– выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці. Мова разглядаецца як агульная форма эстэтычных уяўленняў, яна садзейнічае нараджэнню новых эстэтычных з'яў, захоўвае духоўны вопыт пакаленняў. У шматвекавых традыцыях народнай творчасці адбываецца аб'яднанне разнастайных накірункаў духоўнай дзейнасці і вопыту, у якіх падмуркам індывідуальных намаганняў паўстае калектыўная мастацкая свядомасць;

– распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага селяніна трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны як інтэнсіфікатары народнага духоўнага жыцця. Унутранае жыццё чалавека, яго пабуджэнні выбудоўвалі падмурак сістэмы каштоўнасцей. Яе станаўленне адбывалася з дапамогай традыцыйнага ўкладу, звыклых народных падыходаў да жыцця і выхавання.

Зыходзячы з тэорыі выхавання асобы як мэтанакіраванага працэсу, што прадугледжвае шэраг этапаў і праверку канчатковага выніку, мы маем магчымасць сцвярджаць, што эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы – мэтанакіраваны працэс, які склаўся пад уплывам назапашаных сацыяльна-культурных каштоўнасцей, звязанага з імі эстэтычнага ідэалу і ажыццяўляецца праз сістэму выхаваўчых уздзеянняў. Мэта эстэтычнага выхавання адлюстроўвае абагульнены калектыўны вопыт і выяўляецца праз імкненне да дасягнення эстэтычнага ідэалу народа. З гэтай прычыны народ выкарыстоўваў разнастайныя метады ўздзеяння на асобу. Увага да здабыткаў народнай педагогікі, у тым ліку яе сродкаў і метадаў выхавання, выклікае неабходнасць іх характарыстыкі, аналізу практыкі рэалізацыі ў жыцці. На жаль, у навуковых працах адсутнічае класіфікацыя метадаў народнага выхавання, якая б наглядна дэманстравала спецыфічныя рысы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. На падставе аналізу беларускіх крыніц мы распрацавалі класіфікацыю метадаў эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы. Асноўным крытэрыем класіфікацыі метадаў эстэтычнага выхавання з'яўляецца іх накіраванасць на ўнутраны свет асобы (*інтраверсія*) і накіраванасць ад асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет (*экстраверсія*) са спецыфікай прымянення метадаў у розных сацыяльных падгрупах (сям'і, мясцовай суполцы жыхароў, асяроддзі аднагодкаў).

Першая група метадаў – інтравертаваныя – спрыяе далучэнню асобы да свету прыгажосці: фарміраванне і развіццё ўмення бачыць, адчуваць, успрымаць, ацэньваць прыгожае, перажываць эстэтычныя / неэстэтычныя з'явы. Дадзеныя метады разглядаюцца намі ў выхаваўчай практыцы патрыярхальнай беларускай сям'і (зварот да эстэтычнага пачуцця, унушэнне, перакананне, праца, прыклад і аўтарытэт, парада, прывучэнне, гутарка); мясцовай суполкі жыхароў (грамадская думка, заахвочванне, асуджэнне, ухваленне, узаемная павага); пры выхаваўчым уздзеянні аднагодкаў (праца, назіранне, гульня, гутарка, грамадская думка,

запалохванне); самой асобай (саманазіранне, самааналіз, самаўнушэнне, гульня, саматлумачэнне).

Другая група метадаў – экстравертаваныя скіравана на фарміраванне ўменняў ствараць і захоўваць прыгажосць у паводзінах, зносінах, працы, творчасці, прыродзе. Метады дадзенай групы выкарыстоўваюцца ў сямейным выхаванні (практыкаванне, ухваленне, праца, вымова, прывучэнне); суполкай жыхароў (іспыт, спаборніцтва, грамадская думка, ухваленне, праца, вымова); пры выхаваўчым уздзеянні аднагодкаў (праца, супрадкі, сумеснае баўленне часу); у самавыхаванні (праца, самапланаванне, гульня).

Традыцыйнымі сродкамі эстэтычнага выхавання выступаюць праца, мова, прырода, вусная народная творчасць, абрады, эстэтыка паводзін і г.д.

Эстэтычныя адносіны чалавека да свету цэласна ахопліваюць матэрыяльную і духоўную сферы; звязаны з актыўным пераадоленнем суб'ектам перашкод, якія ўзнікаюць на шляху да жаданай мэты. Узровень рэалізацыі такіх адносін залежыць ад зместу і суб'екта дзейнасці. Рухда прыгажосці ажыццяўляецца з дапамогай традыцыйных сродкаў і метадаў, праз паступовае ўдакладненне і развіццё ідэі найвышэйшай сацыяльнай прыгажосці.

Зыходзячы з тэорыі выхавання асобы як мэтанакіраванага працэсу, што прадугледжвае шэраг этапаў і праверку канчатковага выніку (Л.І. Бажовіч, Л.С.Выгоцкі), мы маем магчымасць сцвярджаць, што эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы – мэтанакіраваны працэс, які склаўся пад уплывам назапашаных сацыяльна-культурных каштоўнасцей, звязанага з імі эстэтычнага ідэалу і ажыццяўляецца праз сістэму выхаваўчых уздзеянняў. Мэта эстэтычнага выхавання адлюстроўвае абагульнены калектыўны вопыт і выяўляецца праз імкненне да дасягнення эстэтычнага ідэалу народа. З гэтай прычыны народ выкарыстоўваў разнастайныя метады ўздзеяння на асобу: гутарка, практыкаванне, благаславенне. Увага да здабыткаў народнай педагогікі, у тым ліку яе сродкаў і метадаў выхавання, выклікае неабходнасць іх характарыстыкі, аналізу практыкі рэалізацыі ў жыцці. На жаль, у навуковых працах адсутнічае класіфікацыя метадаў народнага выхавання, якая б наглядна дэманстравала спецыфічныя рысы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. На падставе аналізу беларускіх крыніц мы распрацавалі класіфікацыю метадаў эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы. Асноўным крытэрыем класіфікацыі метадаў эстэтычнага выхавання з'яўляецца іх накіраванасць на ўнутраны свет асобы (*інтраверсія*) і накіраванасць ад асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет (*экстраверсія*). Істотнай рысай з'яўляецца спецыфіка прымянення метадаў у розных сацыяльных падгрупах (сям'і, мясцовай суполцы жыхароў, асяроддзі аднагодкаў).

Аналіз прац, прысвечаных узроставым асаблівасцям у працэсе выхавання (Л.І. Бажовіч, Л.С. Выгоцкі, Д.Б. Эльконін), дазволіў вылучыць спецыфіку выкарастання традыцыйных метадаў народнай педагогікі (праца, прывучэнне, расповед) з улікам трыяды дзіця-падлетак-юнак. Згодна з крытэрыем якасных змяненняў у эстэтычнай дзейнасці асобы, мы прапануем перыядызацыю метадаў эстэтычнага выхавання ў адпаведнасці з іх прыярытэтнай накіраванасцю:

1. Перыяд пачуццёвага ўваходжання ў свет эстэтыкі (*малецтва*, ад нараджэння да 6-8 гадоў), у які адбываецца фарміраванне непасрэднага эмацыянальнага адлюстравання рэчаіснасці, выкарыстоўваюцца назіранне, унушэнне, растлумачэнне, перакананне. 2. Перыяд фарміравання эстэтычнай свядомасці (*дзяцінства-падлеткавасць*, ад 6-8 да 12-14 гадоў) адметны метадамі выхавання, скіраванымі на выпрацоўку эстэтычных перажыванняў. З дапамогай метадаў працы, гульні, расповеду, гутаркі дзеці прывучаюцца выконваць працоўныя аперацыі, кіруючыся асноўным крытэрыем якасці – прыгажосцю. 3. Перыяд фарміравання сістэмы эстэтычнага светаўспрымання рэчаіснасці (*падлеткава-юнацкі*, ад 12-14 да 16-17 гадоў) характарызуецца пераходам ад выпрацоўкі эстэтычных перажыванняў да арганізацыі рознабаковай практычнай дзейнасці. 4. Перыяд практычнага ажыццяўлення эстэтычнага пераўтварэння рэчаіснасці (*маладосць*, 16-17 год – уступленне ў шлюб) – час арганізацыі эстэтычнай практычнай дзейнасці, якая адбываецца праз працу, святы, абрады, традыцыі і накіравана на развіццё эстэтычнай дасканаласці.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

У дысертацыі даследавана праблема фарміравання традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзяў.

1. Удакладнены паняційна-тэрміналагічны апарат у кантэксце даследавання традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стст., які ўключае паняцці: "эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы", "традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы".

У кантэксце даследавання паняцце *традыцыя* акрэсліваецца як агульнапрызнаная сістэма перадачы сацыяльна значных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, навыкаў, што гістарычна склалася на працягу стагоддзяў пад уплывам нацыянальнай культуры, прыродных асаблівасцей, сацыяльнай спадчыны і накіравана на захаванне і памнажэнне народнага вопыту, неабходнага для станоўчага існавання.

*Вядучай адзнакай* выхавання як працэсу ў межах беларускай народнай педагогікі выступае непарыўнасць, якая падразумявае ўзроставую трыяду: дзіця-падлетак-юнак. Эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы – галіна практыка-выхаваўчай дзейнасці, накіраванай на выхаванне ў асобе жадання, здольнасці ўспрыняцця і разумення таго прыгожага, якое з'яўляецца жыццёва неабходным; фарміраванне на гэтай глебе эстэтычных густаў, эмацыянальных адносін да акаляючага свету і сацыяльнага жыцця праз авалоданне культурай продкаў.

Эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы ў працэсуальным аспекце ахоплівае ўсе ўзроставыя групы, характарызуецца лінейнай працягласцю (ад нараджэння дзіцяці і на працягу ўсяго жыцця); мэтаскіраванасцю (фарміраванне эстэтычна дасканалай асобы); сістэмнасцю (выхоўваюць людзі, прыродная рэчаіснасць, побыт); непарыўнасцю (адбываецца падчас працоўнай дзейнасці і ў вольны час); цыклічнасцю (на працягу года).

Праведзены аналіз даў магчымасць вызначыць у межах даследавання традыцыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы як гістарычна аформленую на працягу стагоддзяў сістэму перадачы эстэтычных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, густаў народа ў працэсе выхаваўчага ўзаемадзеяння пакаленняў пад уплывам нацыянальнай культуры, прыродных асаблівасцей, сацыяльнай спадчыны на падставе народна-педагагічных сродкаў і метадаў [1, 2, 5, 8, 12, 13, 15, 20, 21, 22, 24, 27, 28, 30, 31].

2. Вызначаны параметральныя характарыстыкі і асноўныя ўмовы фарміравання эстэтычнага ідэалу ў беларускай народнай педагогіцы. На фарміраванне эстэтычнага ідэалу ўплывовае значэнне аказала сістэма аб'ектыўных і суб'ектыўных перадумоў. *Аб'ектыўнымі* перадумовамі выступаюць: геаграфічныя (існаванне сезонных змен (вясна-лета-восень-зіма), ландшафтныя краявіды, якія аказваюць адбітак на працу, паводзіны, самаадчуванне і светаўспрыняцце чалавека, што, у сваю чаргу, знаходзіць выражэнне ў творчасці і ўтылітарна-практычнай дзейнасці); біялагічныя (разуменне прыгожым тыповага знешняга выгляду чалавека, прыстасаванага да асяроддзя, асаблівасцей дзейнасці); класавыя (беларуская народная педагогіка замацавала найперш эстэтычны ідэал, што ўслаўляе чалавека-працаўніка, які пераўтварае, упрыгожвае жыццё). *Суб'ектыўнымі* перадумовамі, з нашага пункту гледжання, з'яўляюцца: нацыянальныя (тыповай рысай беларускага сялянства было памяркоўнае, талерантнае стаўленне да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, што пацвярджаецца працяглым мірным жыццём беларусаў, рускіх, украінцаў, яўрэяў, татар і многіх іншых народаў на адной тэрыторыі); рэлігійныя (поруч бесканфліктна суіснавалі некалькі канфесій: праваслаўныя, каталікі, мусульмане, габрэі). Гэта ўзаемна пашырала дыяпазон прымальнасці эстэтычных з'яў, шырыню і глыбіню

эстэтычных пачуццяў. Да вышэй згаданай групы перадумоў адносім таксама працоўныя (прыгожае ўсё тое, што дапамагае працаўніку як практычна, так і духоўна). У агульным накірунку гэта адчуванне выліваецца ў разуменне прыгажосці ва ўтылітарна-практычным сэнсе: прыгожае тое, што нясе карысць, дабро чалавеку. Да суб'ектыўных перадумоў адносяцца таксама маральныя (разуменне прыгожага і маральнага праз адзінства дабра і прыгажосці, але на першае месца выступае маральнасць у паводзінах, зносінах, дзейнасці) і міжнацыянальныя (наколькі поруч пражываюць прадстаўнікі розных народаў, то іх эстэтычныя ідэалы ў пэўнай ступені маюць агульную аснову, падвяргаюцца ўзаемаўплыву) перадумовы.

*Параметральнымі характарыстыкамі* эстэтычнага ідэалу беларускага народа вызначаны *дынамізм, дэмакратызм, кансерватызм*. Пад дынамізмам мы разумеем існаванне шматварыянтнасці эстэтычна значнай з'явы, працэсу, адзінкі (у межах, акрэсленых традыцыямі). З аднаго боку, гэта варыятыўнасць эстэтычных элементаў, носьбітаў эстэтычнай інфармацыі (загадкі пра рэчы, з'явы; прыказкі пра пэўныя паводзіны; шматаблічча апекуноў прасторы. З другога – з'яўленне новага (рэчы, з'явы) нараджае эстэтычнае адлюстраванне ў творчасці (гульні і песні, што датычацца ваенных падзей; загадкі і гульні, што звязаны з бульбай). Дэмакратызм эстэтычнага ідэалу народа як магчымасць і/або патрабаванне для кожнага чалавека валодання майстэрствам дзеля праявы яго ў працоўнай ці мастацкай дзейнасці. Стваральная дзейнасць можа разглядацца як эстэтычная пры ўмове яе віртуознасці, тэхнічнасці, зладжанасці. Кансерватызм як павольнае з'яўленне ці знікненне новых фальклорных форм, форм мастацкай выразнасці, якія дазваляюць кожнаму чалавеку ствараць прыгажосць суадносна з уласным бачаннем, але ў агульным нацыянальным накірунку, што садзейнічае стабілізацыі адметных нацыянальных эстэтычных праяў і адносін. Гэта не дае магчымасці страціць іх нават пад уплывам ідэалаў іншых культур, класаў, часоў.

Вышэйзгаданыя параметры паўплывалі на зменлівасць эстэтычнага ідэалу: ён утрымлівае шэраг варыянтаў аднаго мастацкага твора, змяняецца пад уплывам іншых культур, аднак змяненне адбываецца павольна і ў пэўных межах.

Параметральныя характарыстыкі і асноўныя перадумовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання дазваляюць прадвызначыць выходныя ўстаноўкі і асаблівасці фарміравання эстэтычнага ідэалу ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзяў:

– эстэтычны ідэал беларускай народнай педагогікі трэба разглядаць, па-першае, як адзіны для беларускага насельніцтва, па-другое, у кантэксце ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння працоўнага, маральнага, разумовага, фізічнага ідэалаў. Кожны чалавек мае магчымасць па-свойму рэалізоўваць эстэтычныя запатрабаванні, праяўляць асабісты густ, адчуванне і разуменне прыгажосці. Праз гэта адбываецца

ўзаемны ўплыў на фарміраванне разумення эстэтычнага сэнсу дзеянняў, прасторы, пачуццяў; адбываецца своеасаблівы сінтэз народнага ідэалу: працоўнага (як здольнасць да самаадданай працы), разумовага (знаходлівасць, веды, уменне прагназаваць абставіны), маральнага (дабрыня, спагада, праўдзівасць як вызначальныя рысы чалавечай душы), фізічнага (развітасць цела і рухаў, вытрымка, цягавітасць);

праца з'яўляецца асновай, якая дапамагае злітаваць асобу і калектыў у агульнай эстэтычнай дзейнасці (шэраг народных святаў, абрадавых дзей, фальклорных твораў звязаны з працай);

– інтэграваны характар ідэалу беларусаў праяўляецца ў разуменні першаснасці іх унутраных якасцей: чысціні душы, дабрыні характару, чалавечнасці дзеянняў і учынкаў, практычнага розуму;

– эстэтычны ідэал мае цесную сувязь з сацыяльна-маральнымі паводзінамі, у пэўнай ступені рэгламентуе ўзаемаадносіны з сямейнікамі, суседзямі, аднавяскоўцамі, што выяўляецца ў розных жанрах і формах народнай творчасці;

– эстэтычны ідэал беларускага народа замацаваны ў матэрыяльнай і духоўнай творчасці людзей, іх свядомасці. Механізмам яго перадачы служаць традыцыі, мастацтва, фальклор і абрадавыя дзеі [1, 3, 10, 14, 19, 23, 33, 40].

3. Вызначаны асноўныя ўмовы рэалізацыі традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзяў:

*прыроднае ўздзеянне.* Беларус заўсёды адчуваў адзінства з навакольнай прыродай. Пацвярджэннем гэтаму з'яўляецца традыцыйная культура народа, праз якую сфарміравалася самабытная нацыя з непаўторнай матэрыяльнай і духоўнай культурай. Беларус спрадвеку праз спасціжэнне эстэтычнага ў прыродзе імкнецца да жыцця па законах прыгажосці. Эстэтычным імператывам становіцца разуменне дабра, карыснасці, прыгажосці таго, што дапамагае чалавеку і прыродзе. Пакланенне прыродзе, яе ўвасабленне замацавана ў міфалогіі, культах, абрадах, вераваннях. Казкі, песні, загадкі, замовы, утылітарна-практычная дзейнасць – усё падпарадкавана навакольнаму асяроддзю, прыроднаму ўздзеянню.

*выхаванне ў працы.* Праца злітавана з асэнсаваннем эстэтычнасці вытворчых намаганняў і іх вынікаў. Менавіта пачуццё прыгожага, што нараджаецца праз эстэтычнасць рухаў, гармонію працоўнага рытму і намаганняў, эстэтычнае задавальненне ад плёну зробленага абуджае цікавасць да працоўнай творчасці. Беларуская народная педагогіка пабудавана на любові да працы і працаўнікоў. Працавітасць, па народных уяўленнях, перакілікаецца з эстэтычным светаўспрыманнем, таму чалавека прывучаюць працаваць прыгожа. У вуснай народнай творчасці прэвалюе працоўная тэматыка і думка, што любоў да справы ўзвышае да эстэтычна значнай творчасці. Існуе непасрэдная сувязь паміж святам і

працай, што тлумачыцца імкненнем чалавека эстэтычна ўпрыгожыць жыццё, зрабіць паўсядзённыя абавязкі прывабнымі, абудзіць да іх творчую цікавасць.

*выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці.* Мова (як інтэгратар думак і мар народа), народнае мастацтва захоўваюць духоўны вопыт пакаленняў. Шматвекавыя традыцыі народа – адзінства разнастайных накірункаў духоўнай дзейнасці і вопыту, у якіх індывідуальная творчасць вынікае з калектыўнай мастацкай свядомасці. Народная творчасць распаўсюджвае, пашырае, універсалізуе ідэалы эстэтыкі, яна выступае формай эстэтычнага засваення наваколля, выхавання. Любоў продкаў да прыгожага вынікае з эстэтычна арганізаванай рэчаіснасці: асаблівасцей выбару месца для жылля, матэрыялаў для яго пабудовы, унутранага начыння хаты, асаблівасцей бытавых рэчаў, вопраткі.

*распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага селяніна трыяды: мары, вераванні, успаміны (інтэнсіфікатары народнага духоўнага жыцця).* Духоўны падмурак чалавека – тая аснова, што будуецца з дапамогай традыцыйнага ўкладу, звыклых, спецыфічна народных падыходаў да жыцця і выхавання, якое надае моц асобе. Эмацыянальнасць штодзённага жыцця, здольнасць да эстэтызацыі дзейнасці, падпарадкаванасць маральных учынкаў дапамагаюць эстэтычнаму ўспрыняццю жыцця. Магічна-мастацка-эстэтычныя дзеянні чалавека псіхалагічна ўплывалі на долю, супакойвалі ў прадчуванні і планаванні будучыні (варожбы на шлюб, ураджай, жыццё). Такія вераванні ірацыянальна пашыралі свет, бо вялі да пошуку дабра і прыгажосці. Успаміны з'ядноўвалі прастору жывых і памерлых: праз іх продкі становяцца духоўнымі абаронцамі, яднаючай катэгорыяй [1, 6, 28, 34, 35, 36, 40].

4. Узаемадзеянне метадаў эстэтычнага выхавання на падставе традыцыйных сродкаў дазваляе канкрэтызаваць змест традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы перыяду канца XIX – пачатку XX стагоддзяў. Згодна з крытэрыем якасных змяненняў у эстэтычнай свядомасці і дзейнасці асобы, адзначаем, што працэс эстэтычнага выхавання працягваўся ўсё жыццё. Асаблівая ўвага надавалася перыяду дзяцінства-падлеткавасць-маладосць, што прадстаўлена ў класіфікацыі праз прыярытэтную ўзроставую скіраванасць метадаў.

Перыяд пачуццёвага ўваходжання ў свет эстэтыкі (*малецтва*, ад нараджэння да 6-8 гадоў) характарызуецца накіраванасцю метадаў эстэтычнага выхавання на фарміраванне эмацыянальнага адлюстравання рэчаіснасці праз метады назірання, гульні, растлумачэння, пераканання. Перыяд фарміравання эстэтычнай свядомасці (*дзяцінства-падлеткавасць*, ад 6-8 да 12-14 гадоў) адметны метадамі эстэтычнага выхавання, што скіраваны на фарміраванне эстэтычных перажыванняў. З дапамогай метадаў працы, гульні, расповеду, гутаркі дзеці прывучаюцца выконваць працоўныя аперацыі на аснове такога крытэрыю якасці, як прыгажосць. Стварэнне сістэмы

эстэтычнага светаўспрымання рэчаіснасці (*падлеткава-юнацкі*, ад 12-14 да 16-17 гадоў) аб'ядноўвае папярэдні і наступны перыяды, характарызуецца пераходам ад станаўлення эстэтычных перажыванняў да арганізацыі практычнай дзейнасці. Перыяд практычнага ажыццяўлення эстэтычнага пераўтварэння рэчаіснасці (*маладосць*, 16-17 год – уступленне ў шлюб) асабліва пазначаны арганізацыяй эстэтычна значнай практычнай дзейнасці, якая ідзе праз працу, святы, абрады, традыцыі і накіравана на развіццё эстэтычнай дасканаласці) [1, 4, 7, 14, 16, 18, 24, 25, 31, 38, 39, 41].

5. Распрацавана і прадстаўлена аўтарская класіфікацыя інтравертаваных і экстравертаваных метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы згодна з накіраванасцю на ўнутраны або знешні духоўны ці матэрыяльны свет. Сукупнасць метадаў рэалізуецца праз сям'ю, мясцовую суполку жыхароў, калектыў аднагодкаў і працэс самавыхавання.

Група інтравертаваных метадаў уключае ў сябе пераканание, працу, прыклад і аўтарытэт, назіранне, прывучэнне, унушэнне, гутарку, тлумачэнне, заахвочванне, заналохванне, ухваленне, вымову, зварот да эстэтычных пачуццяў, павагу да старэйшых, грамадскую думку, асуджэнне, ухваленне, прыклад і аўтарытэт, распавед, узаемную павагу, гульню, практыкаванне, выкарыстанне пачуццяў страху, гідлівасці, саманазіранне. Іх галоўная мэта – далучыць асобу да свету прыгажосці праз развіццё ўмення бачыць, адчуваць, успрымаць, разумець, ацэньваць, эстэтычна перажываць з'явы прыгажосці (непрыгажосці).

Група экстравертаваных метадаў прадстаўлена наступнымі: практыкаванне, ухваленне, праца, вымова, прывучэнне, іспыт, спаборніцтва, грамадская думка, сумеснае правядзенне вольнага часу, гульні, пастаноўка перспектывы, супрадкі. Іх спецыфічная рыса - скіраванасць на фарміраванне ўменняў ствараць і захоўваць прыгажосць зносін, працы, творчасці, прыроды [1, 7, 9, 32, 40].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў выхаваўчай практыцы такіх устаноў адукацыі, як дашкольныя ўстановы, агульнаадукацыйныя школы; а таксама ў сістэмах прафесійнай адукацыі рознага ўзроўню; павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі педагагічных кадраў, пры арганізацыі працы культурна-асветніцкіх устаноў; у працэсе самаадукацыі бацькоў. Вырашэнне праблемы эстэтычнага выхавання беларусаў на падмурку традыцыйных народных поглядаў магчыма, калі сучасныя адукацыйныя ўстановы Беларусі актыўна звернуцца да вытокаў нацыянальнага; пры умовах дасканала прадуманага выкарыстання выхаваўча-адукацыйнага патэнцыялу беларускай народнай педагогікі ў планаванні і рэалізацыі выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

Выхаванне эстэтычна развітай і адукаванай асобы ў сучасных умовах ажыццяўлення навучання і выхавання будзе рэальна дзейным пры выкананні гістарычна абгрунтаваных і нацыянальна вызначаных абставін:

- выбар выхаваўчых арыенціраў павінен ажыццяўляцца згодна са спецыфікай нацыянальнага характару і ментальнасці беларускага народа, з улікам асаблівасцей фарміравання эстэтычнага ідэалу, яго трансфармацыі пад уплывам сучаснага соцыума (фарміраванне беларускай нацыі пачалося і адбывалася пры апоры на культурныя здабыткі продкаў, веды пра якія павінны захоўвацца праз усе шляхі трансляцыі культуры, а на гэтай падставе павінна ісці іх развіццё ў коле традыцыйных народна-педагагічных падыходаў; беларускі фальклор, традыцыйная мастацкая творчасць замацавалі і адбіваюць тыя каштоўнасці, што існуюць і павінны развівацца);

- шырокае выкарыстанне сродкаў і метадаў народнай педагогікі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе навучальных устаноў, сямейным і грамадскім выхаванні (пры правядзенні вучэбных заняткаў і выхаваўчых мерапрыемстваў у адукацыйных установах першай і другой ступені, пры спецыяльнай падрыхтоўцы будучых педагогаў; праз метадычнае кансультаванне бацькоў; праз правядзенне тэматычных кансультацый, лекцый, курсаў для шырокага кола грамадскасці);

- планаванне эстэтычнага выхавання сучаснай асобы на падмурку і з улікам выкарыстання народных традыцый эстэтычнага выхавання асобы;

- планаванне і фарміраванне эстэтычнага развіцця падрастаючага пакалення ва ўзаемадзеянні (наша праца паказвае магчымасці іх спалучэння праз навукова-тэарэтычнае, гісторыка-метадалагічнае абгрунтаванні, нагляднa ў выглядзе табліц і схем; таксама праланаваны шэраг неабходных сродкаў і метадаў, што традыцыйна выкарыстоўваліся нашымі продкамі пры эстэтычным развіцці асобы).

Выкарыстанне атрыманых вынікаў у сістэме неперарыўнай адукацыі спрыяе фарміраванню эстэтычна развітай асобы ў інтарэсах устойлівага развіцця грамадства, што дабратворна ўплывае не толькі на асобу, але і на соцыум.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Навуковыя выданні**

1. Туболец. С. Р. Традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы : навуковае выданне / Г. П. Арлова, С. Р. Туболец ; пад агул. рэд. Г. П. Арловай. – Віцебск : УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2008. – 162с.

2. Развитие образования, школы и педагогики в Беларуси в период XIX – начала XXI века : научное издание / А. П. Орлова [и др.] ; под ред. А. П. Орловой. – Витебск : Изд-во УО «ВГУ им. П.М. Машерова». 2013. – с.36-58.

**Артыкулы ў рэцэнзуемых часопісах**

3. Рулёва. С. Р. Эстэтычны ідэал у беларускай народнай педагогіцы / С. Р. Рулёва // Народная асвета. – 2000. – № 11. – С. 118-125.

4. Туболец, С. Р. Сістэма метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы / С. Р. Туболец // Народная асвета. – 2002. – № 11-12. – С. 50-51.

5. Туболец. С. Р. Тэарэтычныя асновы традыцый эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (канец 19 – пач. 20 стагоддзя) / С. Р. Туболец // Веснік ВДУ. – 2010. – № 2 (56). – С. 111-116.

6. Туболец, С. Р. Асноўныя ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы / С. Р. Туболец // Веснік ВДУ. – 2010. – № 3 (57). – С.100-106.

7. Туболец, С. Р. Метады эстэтычнага выхавання беларускай народнай педагогікі (канец XIX – пачатак XX стагоддзяў) / С. Р. Туболец // Вестник Полоц. гос. ун-та. Серия Е, Педагогические науки. – 2010. – № 11. – С. 40-46.

8. Туболец, С. Р. Тэарэтычныя асновы вывучэння традыцый эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы / С. Р. Туболец // Веснік Віцеб. дзярж. ун-та. – 2012. – № 2 (68). – С. 118-125.

9. Туболец, С. Р. Інтравертаваныя і экстравертаваныя метады эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: тэарэтычныя асновы вызначэння / С. Р. Туболец // Вестник Полоц. гос. ун-та. Серия Е, Педагогические науки. – 2012. № 7. – С. 17-23.

10. Туболец, С. Р. Эстэтычны ідэал у беларускай народнай педагогіцы (формы, метады і сродкі павышэння этнапедагагічнай адукаванасці дзяцей, настаўнікаў, бацькоў) / Г. П. Арлова, С. Р. Туболец // Народная асвета. – 2012. – № 12. – С. 26-29.

11. Туболец, С. Р. Беларуская народная педагогіка ў кантэксце гендарнай культуры / С. Д. Мацюшкова, С.Р. Туболец // Веснік Веснік Віцеб. дзярж. ун-та. – 2014. – № 2 (80). – С .91-97.

**Матэрыялы канферэнцый**

12. Рулёва, С. Г. Народная педагогика как фактор становления личности / С. Г. Рулёва // Подготовка социальных педагогов и социальных работников :

проблемы, тенденции, опыт : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 27-28 апреля 1999 г. / УО "БГПУ им.М. Танка" ; редкол. Т. П. Михневич [и др.]. Минск, 1999. – С. 131-133.

13. Рулёва, С. Р. Значэнне народна-педагагічных ведаў пры падрыхтоўцы будучага настаўніка да працоўнага выхавання / С. Г. Рулёва // Современные тенденции трудового обучения и воспитания молодёжи : материалыРеспубл. науч.-практ. конф., Витебск, 1 декабря 1999 г. / УО «ВГУ им. П. М. Машерова» ; редкол. С.И. Малашенков [и др.]. – Витебск, 2000. – С. 169-171.

14. Рулёва, С.Г. Роль народной педагогики в совершенствовании воспитания младших школьников / Н. И. Бумаженко, С. Г. Рулёва // Воспитание младших школьников на ценностях общечеловеческой и национальной культуры : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 15-16 ноября 1999 г. / УО "БГПУ им. М.Танка" ;редкол. В. В. Буткевич [и др.]. – Минск, 2000.— С. 47-49.

15. Рулёва, С. Г. Роль знаний по народной педагогике в процессе подготовки специалистов в области психолого-педагогической деятельности / С. Г. Рулёва // Актуальные проблемы социальной психолого-педагогической работы: материалы республиканской научно-практической конференции,Могилёв, 2-3 марта 2000 г. / УО «МГУ им. А.А.Кулешова» ; под общ.ред. Е. А. Носовой. – Могилёв, 2000. – С. 121-122.

16. Рулёва, С. Р. Сістэма сродкаў і метадаў эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў / С. Р. Рулёва // Беларусь и Европа : взаимодействие культур (история, уроки, опыт, современность) : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 30 ноября – 1 декабря 2000 г. / УО «ВГУ им. П. М. Машерова» ;редкол. А. В. Космач [и др.]. – Витебск, 2000. – С. 282-285.

17. Рулёва, С. Г. Самостоятельная работа одарённых студентов по изучению проблем народной педагогики / С. Г. Рулёва // Шляхі развіцця інтэлекта і творчасці маладых : матэрыялы Рэспубл. навук.-практ. канферэнцыі "Работа з адоранай студэнцкай і вучнёўскай моладдзю : стан, формы і метады, перспектывы развіцця", Гродна, 5-6 мая 2000г. / УА "ГрДУ" ; пад рэд. І. П.Крэня. – Гродна, 2001. – С. 147-149.

18. Рулёва, С. Г. Использование методов народной педагогики как один из путей эстетического развития личности ребёнка / С. Г. Рулёва // Мир искусства и дети: проблемы художественной педагогики : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 15-16 мая 2001г. / УО "ВГУ им. П. М.Машерова" ; редкол. А.И. Мурашкин [и др.]. – Витебск, 2001. – С. 49-51.

19. Туболец, С. Г. Пословицы белорусского и немецкого народов как отражение этнопедагогических традиций воспитания / С. Г. Туболец // Германский славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность : материалыМеждунар. науч.-теор. конф., Витебск, 6-8 декабря 2001 г. / УО «ВГУ им. П.М. Машерова» ; редкол. А.В. Космач [и др.]. Витебск, 2001. – С. 327–329.

20. Туболец, С. Г. Подготовка учителя современной школы: этнопедагогизация образования/ С. Г. Туболец // Общеобразовательная школа в условиях

реформирования: состояние и перспективы : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 13-14 ноября 2002 г. / УО «ВГУ им. П. М. Машерова» ; редкол. : Н. А. Ракова [и др.]. – Витебск, 2002. – С. 218-219.

21. Туболец, С. Г. Изучение народных традиций как компонент профессиональной подготовки специалиста в области педагогики психологии детства / С. Г. Туболец // Актуальные проблемы в области педагогики и психологии детства: материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящённой 25-летию факультета дошкольного воспитания, Могилёв, 9-10 апреля 2003 г. / УО «МГУ им. А. А.Кулешова»; под общ. ред. С. О. Каминской. – Могилёв, 2003. – С. 316 – 317.

22. Туболец, С. Г. Этнопедагогика в подготовке специалиста-педагога: требование времени / С. Г. Туболец // Наука о детстве: современные психолого-педагогические проблемы: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 4-5 декабря 2003 г. / УО «БГПУ им. М. Танка.; отв. ред. Н. В. Литвина. – Минск, 2003. - С. 183-185.

23. Туболец, С. Р. Да вывучэння праблемы маральна-эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы / С. Р. Туболец // Педагогика: история и современность (Проблемы нравственного воспитания): Педагогические чтения, посвящённые памяти академика И. Ф. Харламова, Гомель, 8-9 апреля 2004 г. / УО «ГГУ им. Ф.Скорины» ; отв. ред. В. П. Горленко. – Гомель, 2004. – С. 284-288.

24. Туболец, С. Г. О значении белорусской народной педагогики в формировании профессиональной культуры молодого специалиста / С. Г. Туболец, Т. Д. Вакушенко // Профессиональная культура специалиста: методологические, идеологические, психолого-педагогические аспекты формирования: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Барановичи, 8 апреля 2005 г. / УО «БарГУ»; редкол.: Е. И. Пономарёва (гл.ред.) [и др.]. – Барановичи, 2005. – С. 274-276.

25. Туболец, С. Г. Этнопедагогический подход в работе современного детского сада / С. Г. Туболец // Профессиональная подготовка специалистов социальной и образовательной сфер в условиях трансформации современного общества: проблемы и перспективы : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 15-16 сентября 2005 г./ УО «ВГУ им. П. М. Машерова»; редкол.: А. П. Орлова [и др.]. – Витебск, 2005. – С. 243 – 245.

26. Туболец, С. Г. Этнопедагогический подход к построению современного образовательного процесса / С. Г. Туболец // Актуальные проблемы гармонизации социально-трудовых отношений : материалы VII Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 4 марта 2005 г. : в 2 книгах / УО ФПБ ВФ «МИТСО»; под общ. ред. И. В. Мандрика, В. А. Космача. – Витебск, 2005. – Кн. 1. – С. 261- 263.

27. Туболец, С. Г. О содержании этнопедагогической подготовки специалиста / Т. Д. Вакушенко, С. Г. Туболец // ТехноОБРАЗ 2005 : Технологии непрерывного образования и творческого саморазвития личности студентов : обеспечение качества подготовки специалистов в высшей школе: материалы V

Междунар. науч. конф., Гродно. 14-15 апреля 2005 г. : в 2 ч. / УО «ГрГУ» ; под ред. В. П. Тарантей [и др.]. – Гродно, 2005. – Ч. 1. – С. 161 – 164.

28. Туболец, С. Г. Глобализация и народная педагогическая культура: взаимопересечение / Т. Д. Вакушенко, С. Г. Туболец // Социальные проблемы современного общества и человека: пути решения : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 15-16 марта 2007 г. / УО "ВГУ им. П. М.Машерова"; под ред. Н. И. Бумаженко, Г. А. Качан, С. Д. Матюшковой; отв. за выпуск С. А. Моторов. - Витебск, 2007. – С. 51-52.

29. Туболец, С. Г. Духовные ценности белорусского народа и социальный прогресс современного государства / С. Г. Туболец // Пути, тенденции и направления развития социальной сферы : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 23 мая 2008 г. / УО "ВГУ им. П. М.Машерова"; под общ. ред. А. П. Орловой. - Витебск, 2008. - С. 202-203.

30. Туболец, С. Г. К вопросу об этнопедагогической составляющей профессиональной подготовки специалиста / Т. Д. Вакушенко, С. Г. Туболец // Практическая подготовка специалистов в условиях университетского образования : состояние, проблемы : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 20 марта 2008 г. / УО "ВГУ им. П. М. Машерова"; редкол. Н. А. Ракова [и др.]. – Витебск, 2008. – С. 55-56.

31. Туболец, С. Г. К вопросу о перспективах семейных отношений и семейного воспитания / С.Г. Туболец // Современная семья и проблемы семейного воспитания: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Могилёв, 19-20 марта 2008 г. : в 2 ч. / УО "МГУ им. А. А. Кулешова". – Могилёв, 2008. – Ч.2. – С. 98-103.

32. Туболец, С. Р. Да сістэмы метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы / С. Р. Туболец // Наука – образованию, производству, экономике: материалы XV (62) Регион. науч.-практ. конф. преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, посвящённый 100-летию со дня основания УО «ВГУ им. П. М. Машерова», Витебск, 3-5 марта 2010 г. / УО «ВГУ им. П. М. Машерова» ; редкол. : А. П. Солодков (гл. ред) [и др.]. – Витебск, 2010. – С. 238-239.

33. Туболец С. Р.Змест эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (канец XIX - пач. XX ст.) / С. Р. Туболец // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XVI (63) Регион. науч.-практ. конф. преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 16-17 марта 2011 г. – Витебск, 2011. – Т. 2. – С. 69-71.

34. Туболец, С. Р. Выкарыстанне інтэнсіфікатараў маральна-эстэтычнага жыцця беларускага народа ў сучасных умовах / С. Р. Туболец// Социально-психологические проблемы современного общества и человека: пути решения : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 20-21 октября 2011 г. – Витебск : УО "ВГУ им. П. М. Машерова", 2011. – С. 121-123.

35. Туболец, С. Р. Інтэнсіфікатары маральна-эстэтычнага жыцця беларуса: мары, народныя вераванні, успаміны / С. Р. Туболец // Народная культура Віцебшчыны : вывучэнне, захаванне, папулярызацыя : матэрыялы навук.-практ. канф., прысвечанай 165-годдзю М. Нікіфароўскага, 21 мая 2010 г. / Міністэрства культуры

Рэспубліві Беларусь, Дзяржаўная ўстанова "Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", Установа культуры "Віцебскі абласны краязнаўчы музей" ; рэдкал.: Л. Вакар, Л. Кернажыцкая, В. Шышанаў. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2012. - С. 217-219.

36. Туболец, С. Р. Сродкі беларускай народнай педагогікі ў павышэнні здольнасці ўстойлівасці асобы да стрэсу / С. Р. Туболец// Фундаментальные и прикладные проблемы стресса: материалы IIIМеждунар. науч.-практ. конф., Витебск, 16-17 апреля 2013 г. – Витебск : УО "ВГУ им. П. М. Машерова", 2013. С. 213-216.

37. Туболец, С. Г. Воспитание толерантности в белорусской народной педагогике / Воспитание детей младшего возраста в условиях поликультурного социума : сб. науч. ст. / редкол.: И. Г. Рябова (отв.ред) [и др.]; Мордов. гос. пед. ин-т. – Саранск, 2013. С. 83-87.

38. Туболец, С. Г. Этнопедагогические традиции воспитания детей разного пола в гендерном измерении (на примере белорусской народной педагогики) / С. Г. Туболец, С. Д. Матюшкова // материалы Всероссийской науч.-практ. конф. с международным участием «Народная педагогика в условиях реализации государственного образовательного стандарта начального общего образования» : в 2 ч., Саранск, 16-17 мая 2013 г. / редкол. : И.Рябова (отв.ред) [и др .]; Мордов.гос. пед. ин-т. – Саранск. 2013. – Ч. 1. - С. 90-93.

39. Туболец,С. Г. Этнопедагогические традиции воспитания детей как средство повышения уровня гендерной культуры/ С. Д. Матюшкова, С. Г. Туболец // материалы Междунар. науч.-практ. конф. : Образование в интересах устойчивого развития: достижения и перспективы:, Смоленск, 2014 г. - Смоленск : «Смоленская государственная типография», 2014. – С. 117-124.

**Навукова-метадычны дапаможнікі**

40. Народная педагогіка : вучэб.-метад. дапаможнік / С. Р. Туболец [і інш.] ; пад агул. рэд. Г. П. Арловай. – Віцебск : Выд-ва УА "ВДУ імя П. М.Машэрава", 2006. – с. 108-166.

41. Выкарыстанне беларускіх народных прыказак і прымавак у выхаванні і навучанні дашкольнікаў і малодшых школьнікаў : метад. рэкамендацыі / УА "ВДУ імя П. М. Машэрава" ; аўт.-склад. С. Р. Тубалец– Віцебск : Выдавецтва "ВДУ імя П.М.Машэрава", 2002. – 23 с.

## РЭЗЮМЭ

**Туболец Святлана Рыгораўна**

**Традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзяў**

**Ключавыя словы:** беларуская народная педагогіка, эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы, умовы здзяйснення эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, эстэтычны ідэал, традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы.

**Мэта даследавання**: выявіць і даць цэласную характарыстыку традыцыям эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (канец XIX – пачатак XX ст.).

**Метады даследавання**. Лагічныя метады даследавання: індукцыя, дэдукцыя, аналіз, сінтэз, абагульненне, аналогія, параўнанне. Гісторыка-педагагічныя метады: вывучэнне і аналіз этнаграфічнай, этнапедагагічнай літаратуры, перыядычнага друку, электронных рэсурсаў па тэме даследавання.

**Атрыманыя вынікі іх навізна.** Удакладнены змест паняццяў: "эстэтычнае выхаванне ў народнай педагогіцы", "традыцыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы". Распрацавана аўтарская класіфікацыя метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Вызначана прыярытэтная скіраванасць інтравертаваных і экстравертаваных метадаў эстэтычнага выхавання суадносна з узроставымі асаблівасцямі і напрамкамі эстэтычнага выхавання. Вылучаны галоўныя ўмовы здзяйснення эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (прыроднае ўздзеянне, выхаванне ў працы, выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці, распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларускага селяніна трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны як інтэнсіфікатары народнага духоўнага жыцця).

**Рэкмендацыі па выкарыстанню**. Вынікі дысертацыйнага даследавання ўкаранёны ў сістэме павышэння кваліфікацыі настаўнікаў пачатковых класаў; сістэме культурна-асветніцкай працы ўстаноў культуры Віцебскай вобласці; сістэме практычнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай і адукацыйнай сфер.

**Галіна прымянення.** Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны ў далейшым развіцці этнапедагогікі як навукі: для аптымізацыі дзейнасці сістэмы вышэйшай адукацыі і перападрыхтоўкі кадраў; пры распрацоўцы вучэбна-метадычных дапаможнікаў, лекцыйных і семінарскіх заняткаў, спецкурсаў па этнапедагагічнай тэматыцы.

## РЕЗЮМЕ

**Туболец Светлана Григорьевна**

## Традиции эстетического воспитания в белорусской народной педагогике конца XIX - начала XX веков

**Ключевые слова:** белорусская народная педагогика, эстетическое воспитание в белорусской народной педагогике, условия осуществления эстетического воспитания в белорусской народной педагогике, эстетический идеал, традиции эстетического воспитания в белорусской народной педагогике.

**Цель исследования:** выявить и дать целостную характеристику традициям эстетического воспитания в белорусской народной педагогике (конец XIX – начало XX в.).

**Методы исследования:** логические методы исследования: индукция, дедукция, анализ, синтез, обобщение, аналогия, сравнение. Историко-педагогические методы: изучение и анализ этнографической, этнопедагогической литературы, периодической печати, электронных ресурсов по теме исследования.

**Полученные результаты и их новизна.** Уточнено содержание понятий: «эстетическое воспитание в народной педагогике», «традиции эстетического воспитания в народной педагогике». Разработана авторская классификация методов эстетического воспитания в белорусской народной педагогике. Определена приоритетная направленность интровертированных и экстравертированных методов эстетического воспитания соответственно возрастным особенностям и направлениям эстетического воспитания. Выделены главные условия осуществления эстетического воспитания в белорусской народной педагогике (природное воздействие, воспитание в труде, использование потенциала народного творчества, распространение в повседневной жизни белорусского крестьянина триады: мечты, народные верования, воспоминания - как интенсификаторы народной духовной жизни).

**Рекомендации по использованию.** Результаты диссертационного исследования внедрены в системе повышения квалификации учителей начальных классов; системе культурно-просветительской работы учреждений культуры Витебской области; системе практической подготовки специалистов социальной и образовательной сфер.

**Область применения.** Результаты диссертационного исследования могут быть использованы в дальнейшем развитии этнопедагогики как науки: для оптимизации деятельности системы высшего образования и переподготовки кадров: при разработке учебно-методических пособий, лекционных и семинарских занятий, спецкурсов по этнопедагогической тематике.

## Summary

**Tubolets Svetlana Grigorievna**

## Traditions of aesthetic education in the Belarusian folk pedagogy of late 19-th - early 20-th centuries

**Key words:** Belarusian folk pedagogy, aesthetic education in the Belarusian national pedagogy, terms of aesthetic education in the Belarusian folk pedagogy, aesthetic ideal, traditions, traditions of aesthetic education in the Belarusian folk pedagogy.

**Objective:** to identify and characterize the traditions of aesthetic education in the Belarusian folk pedagogy (late 19-th – early 20-th centuries).

**Research methods:** logical methods: induction, deduction, analysis, synthesis, generalization, analogy, comparison. Historical and pedagogical methods: study and analysis of ethnographic and ethnopedagogical literature, periodicals and electronic resources on the topic of research.

**Scientific novelty and theoretical relevance of the results of the study.** The study clarifies content of such notions as: "aesthetic education in national pedagogy", "tradition of aesthetic education in national pedagogy." It offers the author's classification of aesthetic education methods in the Belarusian folk pedagogy. It identifies priority areas for introverted and extroverted methods of aesthetic education according to age groups and directions of aesthetic education. It highlights the main conditions of aesthetic education in the Belarusian folk pedagogy (exposure to nature, education through work, exploiting the potential of folk art, existence in the daily life of the Belarusian peasant of the triad consisting of dreams, folk beliefs and memories - as intensifiers of traditional spiritual life).

**Recommendations for use.** The results of the dissertation research introduced in the training of primary school teachers; system of cultural and educational work of cultural institutions of Vitebsk region; system of practical training of social and educational spheres.

**Application area:** The results of the dissertation research can be used in the further development ethnopedagogics as a science; to optimize the activity of higher education and retraining; the development of teaching tools, lectures and seminars, special courses on topics ethnopedagogical.

